■ Кантрамарка

УВАГА! АБМЕЖАВАНАЯ БАЧНАСЦЬ!

Падчас «TEART-2015» гледачы бачылі многае. Сэрца японскай танцоўшчыцы Юі Кавагуці ва ўласных руках. Сем амбіцыйных жанчын, якія здолелі дамовіцца паміж сабой і стварыць кабарэ «Dakh Daughters Band». Анегіна, што спавядаецца ў Фэйсбуку, і чэхаўскіх трох сясцёр на цыркавой трапецыі. Але гэты тэкст будзе прысвечаны таму, што гледачы не пабачылі...

Фота Вікторыі ГЕРАСІМАВАЙ.

ТАНЕЦ ЗВОНКУ

Сярод замежных удзельнікаў форуму «TEART» ужо можна вылучыць кола тых, чые спектаклі з'яўляюцца ў праграме амаль штогод: Алвіс Херманіс, Аскарас Каршуновас. «TEART-2015» пераканаў, што гэты спіс можна дапоўніць: Дзмітрый Валкастрэлаў. Тры гады запар спектаклі аднаго з галоўных эксперыментатараў сучаснага расійскага тэатра трапляюць у праграму форуму. Гэтым разам у Мінску паказалі «Танец Дэлі» Івана Вырыпаева, які Валкастрэлаў паставіў у Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным тэатры юных гледачоў імя А.А. Бранцава.

«Танец Дэлі» — сем аднаактных п'ес Івана Вырыпаева, якія складаюць адно мастацкае цэлае. Героямі ўсіх гэтых п'ес з'яўляюцца танцоўшчыца Каця, што прыдумала неверагодны танец «Дэлі», яе каханы Андрэй, яе смяротна хворая маці, некалькі сяброўак сям'і і медсястра. Ва ўсіх сямі тэкстах Вырыпаеў даследуе шлях утварэння мастацтва з чалавечых пакутаў. Дарэчы, п'есы набылі шырокую вядомасць дзякуючы фільму «Танец Дэлі» з Каралінай Грушкай, Ксеніяй Куцепавай ды Арынай Маракулінай у галоўных ролях, які зняў сам Іван Вырыпаеў.

«Танец Дэлі» Валкастрэлава вызначаецца пошукамі новай акцёрскай манеры існавання. Тэкст п'есы, што гучыць у выкананні акцёраў са сцэны, спалучае ў сабе характарыстыкі бытавога маўлення і адначасова захоўвае пэўную рытмічнасць, не ўласцівую бытавым зносінам, але ўласцівую аўтарскаму стылю Вырыпаева. Гісторыі пра тое, як у Каці памерла мама, жонка Андрэя наглыталася таблетак, а балетны крытык пабачыла найлепшы танец у сваім жыцці, але не змагла пра яго напісаць, адбываюцца таксама ў бытавых умовах — у знаёмым і дакладна ўвасобленым інтэр'еры калідора больш-менш прыстойнай бальніцы. Але галоўнай мастацкай ідэяй «Танца Дэлі», на мой погляд, з'яўляецца абмежаванне магчымасці гледача бачыць, якое ў чарговы раз выкарысталі ў сумеснай рабоце рэжысёр Дзмітрый Валкастрэлаў і мастак Ксенія Пературхіна. Уваходзячы ў залу, гледачы выбіраюць, у якім з двух белых павільёнаў заняць месца. Сем п'ес па чарзе іграюцца на дзвюх пляцоўках. І калі, напрыклад, п'еса ідзе ў павільёне А, гледачы павільёна Б бачаць толькі яе відэапраекцыю на экране з бальнічных жалюзі...

ТАНЕЦ УНУТРЫ ГАЛАВЫ

Ідэя абмежаваць здольнасць гледача назіраць за дзеяннем нарадзілася ў творчым тандэме Валкастрэлава і Пературхінай, і з тае пары выкарыстоўваецца творцамі як у сумесных работах, так і ў асабістых. У спектаклі «Самотны хакеіст» Паўла Пражко, які Валкастрэлаў паставіў у рамках «TEART-2013», гледачы разыходзіліся слухаць вершы з нататніка Ігара Драцэнкі па двух пакоях, дзе іх адначасова чыталі дзве актрысы. Умоўныя пакоі былі адасоблены лістамі паперы. Такая тонкая мяжа дазваляла прыслухоўвацца да таго, што адбываецца ў суседзяў, чуць іх эмацыйныя рэакцыі, калі ў вашай прасторы панавала цішыня...

Прыслухоўвацца і ўяўляць даводзіцца і гледачам спектакля «Казка пра тое, што мы можам, а што не» паводле прозы культавых расійскіх сцэнарыстаў Пятра Луцыка і Аляксея Самарадава, адаптаванай драматургам Міхаілам Дурнянковым у маскоўскім МХТ імя А.П. Чэхава. Мастак Ксенія Пературхіна і рэжысёр Марат Гацалаў падзялілі залу на чатыры пакоі, па якіх паволі перамяшчаецца дзеянне спектакля. Глядач, зразумела, займае месца толькі ў адным з іх і не можа памяняць яго да канца спектакля. На падобным прынцыпе заснавана дзеянне і ў сумеснай рабоце Валкастрэлава і Пературхінай у маскоўскім Тэатры Нацый. Гледачы спектакля «Тры дні ў пекле», дзе беларускі драматург Павел Пражко апісвае сучасны Мінск, разыходзяцца па трох вялікіх палатках. Паднятая задняя сценка палаткі дазваляе дзеянню злучаць усе тры прасторы, але не дазваляе гледачам пабачыць ніякую іншую, апроч сваёй.

Неаднаразовае паўтарэнне гэтай мастацкай ідэі не сведчанне пэўнай бездапаможнасці, а наадварот сцвярджэнне яе жыццяздольнасці. На думку Ксеніі Пературхінай, якая ў творчым тандэме выступае яшчэ і тэарэтыкам сучаснага мастацтва, адной з паспяховых стратэгій замацавання новай ідэі з'яўляецца яе бясконцае паўтарэнне. Менавіта яно ў рэшце рэшт вылучае ідэю з шырокай інфармацыйнай плыні і спрыяе таму, што соцыум яе разумее і прымае.

Па сутнасці, ідэя абмежаванай бачнасці ўвасабляе на сцэне наша светаўспрыманне: мы не здольны спасцігнуць свет цалкам, толькі нейкую яго частку. Акрамя гэтага, візуальнае абмежаванне абвастрае нейкія іншыя нашы рэцэптары ды разварушвае ўяўленне. Так, падчас «Танца Дэлі» мы прыслухоўваемся да гукаў за заднікам, спрабуючы ўявіць, што адбываецца ў суседняй глядзельнай зале, уяўляем, як выглядае дзеянне па-за кінаэкранам, спрабуем перакласці яго з кінамовы на тэатральную. Ну і, нарэшце, абмежаванне візуальнага складніка спектакля правакуе нас уступіць у камунікацыю з іншымі гледачамі («А ў вас таксама была відаць відэапраекцыя залы падчас фінальнай сцэны?») і непазбежна абмеркаваць спектакль, дакладна сфармуляваўшы пэўныя ўражанні пра яго. Між іншым, мастацтвазнаўцы сёння выдзяляюць камунікатыўную функцыю як адну з самых важных.

Стваральнікі «Танца Дэлі» прытрымліваюцца пазіцыі, што калі ў тэатры мы бачылі ўсё, то значыць сфера глядацкай цікавасці паступова змяшчаецца да таго, каб нешта не пабачыць. І вось акцёры ўжо танчаць, танчаць, танчаць у нашым уяўленні пра каханне і смерць. Здаецца, мы не супраць.

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ

■

■ Дзеля памяці

Праводзіла і родная Дзвіна

Дзень выдаўся ясны і прыгожы. На асеннім небе з-за невялікіх хмарак выглянула сонейка, і нават не верылася, што гэта ўжо лістапад. Успомнілася назва адной з кніг Алеся Ануфрыевіча — «Сонца на ўсіх адно». Тут, на сакральным полацкім месцы, дзе вузкая вірлівая Палата ўпадае ў шыракаплынную Дзвіну, паплылі кветкі жалобы па сыне гэтай зямлі, які завяшчаў, каб яго прах назаўсёды вярнуўся ў гэтыя святыя для яго воды.

І як зямны яго працяг стаялі тут, на Дзвінскім беразе, дачка Наталля, унук Яўген, з якімі разам мы прыехалі ў Полацк, каб выканаць апошнюю волю Алеся Савіцкага, пісьменніка, франтавіка, партызана, ганаровага грамадзяніна роднага горада.

Разам з сяброўкай яго дзяцінства заслужанай настаўніцай Беларусі, вядомай палачанкай Нінай Уладзіміраўнай Азернікавай мы падышлі да Вала Івана Грознага, ля падножжа якога стаялі хаты бацькоў Савіцкага і яго бабулі. Бабуліна хата захавалася і па сённяшні дзень, але жывуць тут ужо іншыя, невядомыя людзі. Ды і завулачак вуліцы Стралецкай непазнавальна змяніўся. Але памяць жыве даўжэй, і праз аповеды Ніны Уладзіміраўны мы дакраналіся да дзіцячых і юнацкіх гадоў Сашы Савіцкага, які адсюль у свае пятнаццаць гадоў пайшоў у партызанскі атрад, каб змагацца за Радзіму супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

А горад таксама памятае свайго славутага земляка. У гэтым мы пераканаліся, калі зайшлі ў цэнтральную раённую бібліятэку. Тут сабраліся дзясяткі людзей, каб выказаць словы спачування блізкім, каб узгадаць цёплым словам пісьменніка і патрыёта. Гэта было не фармальным мерапрыемствам, людзі прыйшлі не па разнарадцы, а па закліку сэрца, бо ведалі, што ў гэты дзень, таксама выконваючы волю Савіцкага, родныя прывезлі ў падарунак кнігі пісьменніка — яго трохтомнае выданне «Дзівосы Лысай гары», за што ён быў удастоены Дзяржаўнай прэміі.

Цёплыя словы казалі ўдзельнік літаб'яднання «Наддзвінне» (якое пасля Вялікай Айчыннай вайны ўзначальваў Алесь Савіцкі) Віктар Карасёў, бібліятэкар Валянціна Крук, супрацоўнікі бібліятэк горада і раёна. І хоць было самотна і скрушна, але ў сэрцы нарадзілася і ўдзячнасць гэтым людзям, і радасць, што тут памятаюць «полацкага мальца», як называў нярэдка сябе Алесь Ануфрыевіч, што ён заслужыў сваім жыццём і творчасцю іх павагу і любоў.

А кветкі па Дзвіне паплылі ў вечнасць. Як памяць пра вернага сына гэтай зямлі — Алеся Савіцкага.

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

■

■ Сацыяльныя тэхналогіі

НА МОВЕ МАЛЮНКАЎ

Хутка з'явіцца мабільны дадатак, які дапаможа камунікаваць людзям з аўтызмам

Па афіцыйнай статыстыцы, толькі ў Мінску жыве 800 дзяцей з аўтызмам. Большасці з іх складана стасавацца з навакольнымі: малыя не размаўляюць. Каб гэтыя дзеці (дый дарослыя з такім дыягназам) маглі кантактаваць з іншымі людзьмі, у краіне распрацоўваецца спецыяльны мабільны дадатак. «Камунікатар для людзей з аўтызмам» будзе даступны ўжо ў снежні.

У аснове праграмы — папулярная ў свеце сістэма альтэрнатыўнай камунікацыі PECS. Гэта набор картак па розных катэгорыях (напрыклад, дзеянні, ежа, прадметы), з якіх чалавек можа складаць сказы. Дзеці з аўтызмам і цяпер імі карыстаюцца ў папяровым выглядзе, аднак, зразумела, насіць з сабой паўсюль альбом з карткамі нязручна. Перавесці ўсё ў электронны фармат узялася кампанія «Ваймікс», якая шэсць гадоў займаецца напрамкам mHealth (мабільная медыцына).

— Мяркуецца, што сістэма будзе ўсталёўвацца на планшэт, на якім, акрамя гэтага дадатку, нічога не будзе. Каб чалавек з аўтызмам не ўключыў выпадкова незнаёмую праграму, — тлумачыць **дырэктар кампаніі Дзяніс ТАЛСТАШОЎ**. — Сказы, што складаюцца з картак, паказваюцца на экране або агучваюцца. Ёсць некалькі набораў малюнкаў: ад рэалістычных да абстрактных. Розныя людзі трапляюць на розныя ўзроўні. У аднаго — фотаздымкі, у іншага — набор рысачак. Можна будзе дабаўляць і свае карткі. Асобныя пазіцыі, напрыклад слова «мама», складана выразіць агульнай карцінкай, таму патрэбны канкрэтны фотаздымак. Па нашых падліках, 75% дзяцей змогуць карыстацца стандартным наборам картак. Акрамя гэтага, будзе праграма «Нататнік», дзе фразы проста ўводзяцца тэкстам і агучваюцца. Пасля праведзеных эксперыментаў мы бачым, што такія дадаткі здымаюць камунікацыйны бар'ер.

Распрацоўшчыкі будуць рэгулярна звязвацца з бацькамі дзяцей з аўтызмам і спецыялістамі і на падставе іх водгукаў удасканальваць праграму. «Важна стварыць экасістэму вакол дадатку, — кажа Дзяніс Талсташоў. — Так, калі мы рабілі мабільны памочнік для людзей з лімфомай, то аддалі вялікі кавалак часу менавіта суправаджэнню». Пасля з'явіцца і другая версія камунікатара. Яе дапоўняць гульнявымі элементамі: за поспехі (напрыклад, калі дзіця сабрала нейкі складаны сказ хутчэй, чым учора) — маленькія прызы. Пазнейшая версія будзе таксама аналізаваць фразы, якімі карыстаецца чалавек на працягу месяца-двух, і адзначаць, ці ёсць прагрэс.

Дадатак змесціць у краму Google, адкуль яго можна будзе спампаваць бясплатна. Распрацоўка стане карыснай не толькі людзям з аўтызмам. Праблемы з маўленнем узнікаюць і ў тых, хто перанёс інсульт ці страціў голас праз хваробу або хірургічнае ўмяшанне. У ідэале такія тэхналогіі павінны быць паўсюль: у паліклініках, кавярнях, крамах.

Фінансавы бок праекта ўзяла на сябе кампанія Velcom. Паводле слоў **вядучага спецыяліста аддзела карпаратыўных камунікацый Віктара ПАЗДНЯКОВА**, гэты мабільны дадатак — акно ў свет для дзяцей і дарослых з аўтызмам: «Падобныя праграмы ўжо ёсць, але яны на англійскай мове і працуюць толькі на гаджэтах Apple. Не кожная сям'я можа дазволіць сабе аддаць грошы на такую тэхніку, таму наша версія будзе для аперацыйнай сістэмы андроід і на рускай мове».

— Здорава, што беларускі бізнес сёння надае ўвагу грамадскім арганізацыям, — адзначае **дырэктар таварыства «Дзеці. Аўтызм. Бацькі» Таццяна ЯКАЎЛЕВА**. — Галоўная задача гэтага праекта — сацыяльная інклюзія. У Мінску, дарэчы, якраз праводзіцца серыя семінараў для бацькоў і спецыялістаў па выкарыстанні сістэмы альтэрнатыўных камунікацый PECS.

Новы дадатак дапаможа дзецям і ў адукацыі. «Без камунікацыі веды немагчымыя. Ніяк, — каментуе **дацэнт кафедры псіхалогіі БДУ Таццяна СІНІЦА**. — Ёсць шмат спосабаў атрымаць інфармацыю, але яна сама па сабе не з'яўляецца рэальнымі ведамі, калі няма ўзаемадзеяння. Важна разумець, што камунікатар — гэта толькі сродак. Само наваколле павінна быць гатовым да таго, што некаторыя людзі выказваюць свае думкі не такім спосабам, як усе».

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■